*Настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА “Гімназія г.Быхава”*
*Дзяменцій Людміла Васільеўна*

Шаноўныя вучні! З урокаў беларускай мовы вы добра ведаеце, што ў беларускай мове будаўнічым матэрыялам для слова служаць марфемы.

*Марфем*ы (грэч. morphe – форма) – найменшая частка слова з пэўным значэннем. Так, у слове *беленькі* тры марфемы: бел-, -еньк-, -і-. Марфема бел- выражае асноўнае значэнне прыметы (колеру); -еньк- - мае памяншальна-ласкальнае значэнне; -і – граматычныя значэнні адзіночнага ліку, мужчынскага роду, назоўнага склону. Гэтыя часткі нельга падзяліць на больш дробныя, якія б мелі значэнне; менавіта наяўнасцю лексічнага або граматычнага значэння марфемы адрозніваюцца ад гукаў і складоў, якія таксама выдзяляюцца ў слове.

Прапаную вам заданні, накіраваныя на ўдасканаленне і паглыбленне ведаў па раздзеле “Марфеміка”. Спачатку ўзгадаем тэарэтычныя палажэнні (Памятка 1), а потым замацуем гэта на практыцы.

| **ПАМЯТКА 1** |
|---|
| **МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА** |

## 1. КАНЧАТАК

*зменная службовая марфема, якая ўтварае граматычныя формы слова і служыць для сувязі яго з іншымі словамі ў сказе.*

| НЯМА КАНЧАТКА | НУЛЯВЫ КАНЧАТАК |
|---|---|
| 1. прыслоуе: *весела, злева* | 1) некаторыя наз. Мн.л. Р.скл: *песень* |
| 2. дзеепрыслоўе: *сустракаючы* | 2) наз. 2-га скл., м.р., адз.лік, Н.скл: *дзень* |
| 3. нязменныя назоўнікі*: эскімо* | 3) кароткая форма прыметнікаў і дзеепрыметнікаў м.р., адз.лік: *прачытан, весел* |
| 4. інфінітыў: *бегчы* | 4) прыналежныя прыметнікі: *братаў, жончын* |
| 5. службовыя часціны мовы: *толькі* | 5) дзеясловы прошлага часу, адз.ліку, м.р.: *чытаў;* дзеясловы загаднага ладу: *прачытай, вымый* |
| | 6) кольсныя лічэбнікі ў Н.скл., акрамя два, дзве, тры, чатыры, трыста, чатырыста, сто, дзвесце, тысяча: *восем, пятнаццаць* |

## 2. ПОСТФІКС

*афікс, які знаходзіцца ў слове пасля канчатка ці формаўтваральнага суфікса.*

| | |
|---|---|
| -СЯ, -ЦЦА (у дзеясловах цяп.часу, адз.ліку, 3-й асобы) | *знайшоўся, мыецца* |
| -ца | *весяляцца* |
| -це (загадны лад мн.ліку) | *кіньце* |
| -сьці (-сь) | *хтосьці* |
| -небудзь | *дзе-небудзь* |

# 3. НУЛЯВЫ СУФІКС

| Утварэнне слоў пры дапамозе нуль-суфікса | |
|---|---|
| плакаць → плач | дзеяслоў – аддзеяслоўны назоўнік |
| людзі → люд | назоўнік мн.л. – назоўнік адз.ліку |
| настаўнік → настаўніца | наз. м.р. – наз. жаночага роду |
| золата → залаты | назоўнік - прыметнік |
| сем → семы | колькасны ліч. – парадкавы лічэбнік |
| нага → бязногі | назоўнік - прыметнік |

# 4. АСНОВА

| Формаўтваральныя марфемы ў формаўтваральную аснову не ўваходзяць | |
|---|---|
| 1. канчаткі | зіма, шчаслівыя, малюеш |
| 2. суфіксы інфінітыва –ць, -ці, -чы | крычаць, несці |
| 3. суфіксы дзеепрыметнікаў | прачытаны, склеены, вымыты |
| 4. суфіксы дзеепрыслоўяў *–учы, -ючы, -ачы, -ячы, -ўшы, -шы* | чытаючы, просячы, прынёсшы |
| 5. суфіксы дзеясловаў прошлага часу –л-, -ў | намаляў, намалявала |
| 6. суфіксы ступеней параўнання | разумнейшы, грамчэй |
| 7. злучальная галосная ў складаных словах | параход, белакрылы |

## ЗАДАННІ ДА РАЗДЗЕЛУ “МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА”

*Для таго, каб замацаваць тэатэтычны матэрыял, прапаную выканаць наступныя заданні. Пры неабходнасці звяртайцеся да “Марфемнага слоўніка беларускай мовы”. Пасля выканання параўнайце свае адказы з эталонам (адказамі).*

**1. У кожным радзе падкрэсліце чацвёртае “лішняе”. Растлумачце свой выбар.**

А) паджылкі, падбародак, падарунак, падвеска;

Б) пакупка, русалка, указка, ёлка;

В) бязмен, бязлюддзе, бяздум’е, бязводдзе;

Г) засмоктванне, катаванне, насушванне, нахіленне;

Д) футболка, першынец, курсант, дачушка;

Е) пенснэ, філе, кашнэ, яслі.

**2. Запоўніце табліцу.**

*Словы для аналізу: асушэнне, ёмістасць, ігральны, паўзабыты, распытванне, фантазёрка.*

| прыстаўка | корань | суфікс | суфікс | канчатак |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

**3. Размяркуйце словы ў два слупкі.**

Агонь, бацька, гарэм, загіб, навічок, кірмаш, навіна, нарцыс, нязгода, парнік, парашут, развоз, сланечнік, сэрца, факір, чэмпіянат.

| Невытворная аснова | Вытворная аснова |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

**4. Адзначце нумары слоў, у якіх ёсць указаныя прыстаўкі.**

| | на- | аб- | перад- | рас- |
|---|---|---|---|---|
| 1 | наадрэз | абагаціць | перадабедзенны | расказванне |
| 2 | навек | абадок | перадкастрычніцкі | раствараць |
| 3 | навінка | аббегчы | перадрыжаць | расток |
| 4 | навушнік | абгон | перадаць | раскапаць |
| 5 | нагар | абедаць | перадваенны | расхлябаны |
| 6 | надарваць | абажур | перадзел | расціць |
| 7 | надвор'е | абзваніць | перадаваць | раскладны |
| 8 | надзьмуты | аб'ект | перадвыбарны | раствор |
| 9 | надземны | абвіць | перадумаць | раскол |
| 10 | надыход | абмяркоўваць | перадплечавы | расплата |
| адказ: | | | | |

**5. Адзначце словы з аднолькавай марфемнай будовай**

| | | | |
|---|---|---|---|
| А | зорна | застукаць | мужнасць |
| Б | гузік | крыва | разетка |
| В | ветлівасць | накупіць | духмяна |
| Г | асістэнт | певень | зычлівец |
| Д | дарожка | раз'ехацца | медыцына |

# АДКАЗЫ

**1. У кожным радзе падкрэсліце чацвёртае “лішняе”. Растлумачце свой выбар.**

А) паджылкі, падбародак, падарунак, падвеска: *у гэтым слове прыстаўка па-, ва ўсіх астатніх – пад-*.

Б) пакупка, русалка, указка, ёлка: у выдзеленым слове няма суфікса -к-;

В) бязмен, бязлюддзе, бяздум’е, бязводдзе: у выдзеленым слове няма прыстаўкі;

Г) засмоктванне, катаванне, насушванне, нахіленне: у выдзеленым слове суфікс –енн-, у астатніх –нн-;

Д) футболка, першынец, курсант, дачушка: у выдзеленым слове два суфіксы; у астатніх – адзін.

Е) пенснэ, філе, кашнэ, яслі: выдзеленае слова мае канчатак, астатнія – нескланяльныя, таму канчатка не маюць.

**2. Запоўніце табліцу.**

| прыстаўка | корань | суфікс | суфікс | канчатак |
|---|---|---|---|---|
| а- | -суш- | -энн- | | -е |
| | ём- | -іст- | -асць | □ |
| | ігр- | -а- | -льн- | -ы |
| паў- | -забы- | -т- | | -ы |
| рас- | -пыт- | -ва- | -нн- | -е |
| | фантаз- | -ёр | -к- | -а |

**3. Размяркуйце словы ў два слупкі.**

| Невытворная аснова | Вытворная аснова |
|---|---|
| Агонь, бацька, гарэм, кірмаш, нарцыс, парашут, сланечнік, факір. | Загіб, навічок, навіна, нязгода, парнік, развоз, сэрца, чэмпіянат. |

4. **4. Адзначце нумары слоў, у якіх ёсць указаныя прыстаўкі.**

| | на- | аб- | перад- | рас- |
|---|---|---|---|---|
| 1 | наадрэз | абагаціць | перадабедзенны | расказванне |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 2 | навек | абадок | перадкастрычніцкі | раствараць |
| 3 | навінка | аббегчы | перадрыжаць | расток |
| 4 | навушнік | абгон | перадаць | раскапаць |
| 5 | нагар | абедаць | перадваенны | расхлябаны |
| 6 | надарваць | абажур | перадзел | расціць |
| 7 | надвор'е | абзваніць | перадаваць | раскладны |
| 8 | надзьмуты | аб'ект | перадвыбарны | раствор |
| 9 | надземны | абвіць | перадумаць | раскол |
| 10 | надыход | абмяркоўваць | перадплечавы | расплата |

**5. Адзначце словы з аднолькавай марфемнай будовай**

| | | | |
|---|---|---|---|
| А | зор-н-а | за-стук-а-ць | муж-н-асць |
| Б | гузік | крыв-а | разетк-а |
| В | вет-л-ів-асць | на-куп-і-ць | дух-мян-а |
| Г | асіст-энт | певень | зыч-лів-ец |
| Д | дарож-к-а | раз'-ех-а-ц-ца | медыц-ын-а |